их экзистенциальных признаков. Ее актуальный смысл создается не только «буквальным» значением составляющих ее компонентов, а в значительной степени предопределяется целевыми установками говорящего, что в совокупности дает основание определять ее статус как ф о р м а л ь н о - б ы т и й н ы й. Как и в случае классической бытийной структуры «*il y a* + N», информационным центром формально-бытийной структуры «N + *il y a*» является именной компонент. Однако если в первом случае он становится им автоматически в силу своей новизны для адресата и конечной (рематической) позиции, в формально-бытийной структуре вынесение именного компонента в информационный фокус определяется его прагматической значимостью с позиции говорящего.

## ЛИТЕРАТУРА


1. *Grevisse, M.* Le Bon Usage / M. Grevisse, A. Goosse. – 16e éd. – Bruxelles: De Boeck Supérieur, 2016. – 1760 p.
2. *Blinkenberg, A.* L'ordre des mots en français moderne / A. Blinkenberg. – Copenhagen: Levin and Munksgaard, 1928. – 241 p.



The article is devoted to the analysis of the specific syntactic French structures with a noun preceding the existential formula *il y a*. Its comparison with traditional personal and impersonal existential sentences allowed to reveal its intermediate status in the system of means of expressing the category of existence which is defined as formally existential.



**А. А. Биюмена, Е. П. Моссэ**
(Минск, Беларусь)


# РЫТМІЧНЫЯ АНАМАЛІІ Ў ПАЭТЫЧНЫМ ТЭКСЦЕ


Артыкул прысвечаны рэалізацыі анамаліі ў сістэме рытму паэтычнага тэксту. Авятляюцца знакавая прырода рытмічнай анамаліі, яе ўзаемадачыненні з метрычным канонам, аналізуецца стылістычны і інфармацыйны патэнцыял парушэнняў рытму ў вершы. У межах даследавання таксама ўздымаецца пытанне аб ролі эстэтыкі недасканалага ў сучасным культурным дыскурсе.



К л ю ч е в ы е   с л о в а: *паэтычны рытм, рытмічная анамалія, метр, інфармацыйная каштоўнасць, бінарная апазіцыя, рызома.*


Прадметам нашага даследавання з'яўляюцца анамаліі на ўзроўні рытмічнай арганізацыі паэтычнага тэксту. У адным з інтэрв'ю руская паэтка Вольга Седакова разважае аб кампазіцыйных канонах у паэзіі і аб адыходзе ад іх на прыкладзе аднаго свайго радка: «Скажем, в первой строке: *Неужели, Мария, только рамы скрипят…* – лишний безударный слог. Сделать эту

строку регулярной ничего не стоит – и, по видимости, без смысловых потерь: *Неужели, Мария,* ***лишь*** *рамы скрипят… –* и видите: это не просто тускло, но фальшиво!» [1].

У той жа час аўтар заўважае, што ні строгае вытрымліванне канона, ні яго абвяржэнне не можа служыць мерай «правільнасці» і «годнасці» тэксту, якой, зрэшты, не існуе, бо кожны твор вымагае адмысловага «аўтарскага» канона. З гэтага вынікае супярэчлівая і тым не менш справядлівая выснова: як захаванне, так і разбурэнне парадку можа паспрыяць росту інфармацыйнай каштоўнасці – усё залежыць ад зыходнага стану сістэмы, ад якога і вядзецца адлік. Калі першапачатковым станам сістэмы ёсць стан упарадкаванасці, то ўсё, што з яго выбіваецца, будзе выхоплівацца ўспрыманнем і павышаць складанасць кода. Пры гэтым слушна і адваротнае: на фоне хаатычнага размеркавання элементаў унутры сістэмы пробліск пэўнай заканамернасці будзе выглядаць як анамалія і прымаць на сябе большую частку інфармацыйнай вагі. Дарэчы, гэтая мадэль выдатна апісвае і сучасныя паэтычныя тэндэнцыі, калі сярод пераважнай большасці свабодных вершаў класічныя ўзоры паэзіі лічацца, хутчэй, адхіленнем ад нормы і эстэтычным перажыткам.

У межах дадзенай работы, аднак, з прычыны прынятага за сістэму каардынат менавіта класічнага метра, анамальнасць мы надалей будзем разумець усё-такі згодна з першай трактоўкай – як адхіленне ад метрычнага стандарту. За аснову гэтага даследавання мы возьмем прыватную праяву апазіцыі *норма – анамалія*, а менавіта апазіцыю *метр – рытм*, дзе метр – гэта строгае, упарадкаванае чаргаванне ў вершы націскных і ненаціскных пазіцый, якое рэалізуецца ў рамках метрычнага канона; а рытм – рэальны гукавы лад канкрэтнага вершаванага радка ў супрацьлегласць метрычнай схеме.

Калі ў найпрасцейшую сістэму на аснове бінарнай апазіцыі (націскны/ненаціскны склад) уводзіцца пазасістэмны элемент рытму, то гэта мае два важныя наступствы: па-першае, павышэнне складанасці сістэмы разам са стратай магчымасці яе кампактнага апісання; па-другое, узрастанне инфармацыйнай каштоўнасці з прычыны зніжэння яе прадказальнасці і звязанага з гэтым пераломy чытацкага чакання. У. Эка тлумачыць, што ў тэорыі інфармацыі адзінка інфармацыі – гэта так званы біт, то бок інфармацыя, якую мы атрымліваем у ходзе выбару паміж дзвюма роўнавераемнымі магчымасцямі. І, па сутнасці, любая інфармацыя можа быць прадстаўлена (закадавана) у выглядзе сумы аперацый выбару паміж элементамі бінарных апазіцый. Пры гэтым чым вышэйшая роўнаверагоднасць з'яўлення розных элементаў, тым больш непрадказальнай, неўпарадкаванай ёсць сістэма; і наадварот, у сітуацыі, калі адзін элемент мае верагоднасную перавагу перад другім, сістэма здабывае большую прадказальнасць і, як вынік, меншую інфармацыйную вагу [2, с. 52–55]. Напрыклад, мы маем метрычную сістэму з 9 пазіцый, якія могуць быць запоўнены націскным або ненаціскным складам

. . . . . . . . . ; –

і аўтар вырашае, што структура радка павінна ўключаць у сябе тры харэічныя ступы і адну дактылічную:

/ – / – / – – / – .

Паколькі дзве харэічныя ступы стаяць на пачатку радка, яны тым самым задаюць прадказальную структурную мадэль яго інфармацыйнай сістэмы. Чытач, згодна з засвоенай у долі секунды мадэллю, справядліва чакае з'яўлення націску таксама на месцы 7-й пазіцыі. Але яго чаканне не апраўдваецца, а гэта значыць, што ступень прадказальнасці сістэмы ў дадзенай пазіцыі рэзка зніжаецца, паколькі не выконваецца зададзеная ад пачатку мадэль, і выбар паміж элементамі бінарнай апазіцыі – націскным або ненаціскным складам – становіцца роўнавялікім.

Не меней мэтазгоднай нам таксама ўяўляецца паралель паміж супрацьпастаўленнем метра з рытмам і сістэмы мовы з яе рэалізацыяй у маўленні, на якое ў свой час указаў Ф. дэ Сасюр. Некаторыя даследчыкі акурат бачаць у адыходзе ад строгага канона вершаскладання вынік палемікі з нейкай абстрактнай тэарэтычнай сістэмай метра, якая мае на мэце наданне паэтычнаму твору асобага прасадычнага стылю і ажыццяўленне творчай інтэнцыі аўтара.

Іншыя, аднак, не прызнаюць інтэрпрэтацыю верша ў тэрмінах сістэмы і, адпаведна, адмаўляюцца прыпісваць яму такія сістэмныя характарыстыкі, як структурнасць, лінейнасць, упарадкаванасць і г.д. Адным з прыкладаў ёсць трактоўка прыроды верша Ж. Дэлезам і Ф. Гватары, згодна з якой верш – гэта не мёртвае сістэмнае ўтварэнне ў духу Ф. дэ Сасюра, а – і тут яны ўводзяць новае паняцце для вызначэння асобай формы існавання верша – *рызома*, т.б. «неструктурный и нелинейный способ организации текста, оставляющий возможность для самофигурирования» [3, с. 28]. Паняцце рызомы (ад фр. *rhizome* 'карэнічша') ёсць адным з ключавых паняткаў філасофіі постструктуралізму і постмадэрнізму. Прырода самой паэзіі ў дадзеным ракурсе ўяўляецца, як адзначае Ю.В. Шацін, крайне амбівалентнай, і невядома, ці паняцце сістэмы дастасавальнае да яе ў прынцыпе і як у кантэксце агульнай супрацьсістэмнасці паэзіі вызначыць статус «яшчэ больш несістэмных» паэтычных дэвіяцый: «Сейчас было бы преждевременным отвечать на вопрос, чем является феномен стихотворного текста – реализацией потенциальной системы языка или ризомой, направленной на разрушение такой системы. Вполне вероятно, что он расположен на границе двух реальностей, которая взывает к принципу дополнительности в его интерпретации, подобно тому, как физики описывают явление фотона – то как волну, то как частицу» [3, с. 28].

Такім чынам, характар паэзіі нельга вызначыць адназначна як сістэмны або рызаматычны: кантынуум паэзіі, як і кантынуум мовы, мае ўнутраную градацыю, адзін полюс якой выяўляе высокую ступень структурнай арганізацыі (як у класічных творах), а другі развіваецца на аснове дэканструкцыі апошняй, адначасова адмаўляючы і інтэгруючы яе і здабываючы рысы рызаматычнасці.

Паняцце анамаліі не вельмі ўпісваецца ў класічную антычную канцэпцыю прыгажосці і гармоніі, якая звязвае дадзеныя праявы з катэгорыямі меры, прапорцыі, упарадкаванасці, сувымернасці і г.д. Спрабуючы адшукаць альтэрнатыўныя тэорыі, якія б поўна і адэкватна апісвалі эстэтычны кшталт анмалій, а таксама засведчвалі іх улучанасць у канцэпт мастацкай і штодзённай гармоніі, мы звярнулі ўвагу на традыцыйныя паняткі філасофіі і рэлігіі Японіі, а менавіта на панятак *вабі-сабі*, які ставіць акцэнт на прыгажосці ўзаемадзеяння дасканалага і недасканалага, пранікнення элементаў недасканаласці ў дасканаласць і як вынік авысакароджванне апошняй за кошт ускладнення, дэфармацыі яе ўнутранага эстэтычнага рытму. Гэта пацёртасць фактуры, крывізна формы і асіметрычнасць дэталяў, а разам з тым і іншы ўзровень эстэтычнага ўспрымання, на якім прыгажосць мысліцца і па-за межамі выверанай упарадкаванасці.

Новы погляд на няправільнасць і яе актыўнае задзейнічанне ў побытавым жыцці і мастацтве прадыктаваны сцвярджэннем з нядаўняга часу іншай эстэтычнай парадыгмы ў сусветнай культуры, якая і прыўносіць анамальныя тэндэнцыі ў прыватнасці і ў сучасную паэзію. Але гэта не проста даніна модзе, як можна было б падумаць, а разгортванне згодна з апісанымі вышэй фундаментальнымі эстэтычнымі, псіхалагічнымі і структурнымі законамі ўспрымання збалансаванай дыялектычнай прыгажосці ва ўзаемадзеянні правільнага і няправільнага.

## ЛІТАРАТУРА


1. *Седакова, О. А.* Чтобы речь стала твоей речью : интервью В. Полухиной / О. А. Седакова // Новое литературное обозрение. – 1996. – № 17. – С. 318–354.
2. *Эко, У.* Отсутствующая структура: введение в семиологию / У. Эко; пер. с итал. В. Г. Резник, А. В. Погоняйло. – СПб : Симпозиум, 2006. – 544 с.
3. *Шатин, Ю. В.* Ритм как система и как феномен. Два способа интерпретации русского стихотворного текста / Ю. В. Шатин // Критика и семиотика. – 2016. – № 1. – С. 26 – 35.



The article deals with the issue of irregular rhythm in poetry as a form of language anomaly. It discusses the phenomenon of rhythm-based anomalies from the semiotic prospective and analyses its stylistic functions and information capacity.



**Е. А. Булат**
(Минск, Беларусь)


# ОТРИЦАНИЕ КАК МЕХАНИЗМ РЕЧЕВОГО ВОЗДЕЙСТВИЯ ПОЛИТИЧЕСКОГО ДИСКУРСА


Предметом исследования являются языковые средства выражения отрицания в коммуникативном процессе на материале испаноязычной публицистики. Анализируется принцип отрицания в газетном тексте с учетом прагматической концепции и в фокусе